Беларускае радыё “Рацыя”

06.12.2019

# У Нацбібліятэцы – унікальная калекцыя кніг з аўтографамі

Васіль Кроква

Нацыянальная бібліятэка Беларусі паслядоўна і старанна стварае сваю калекцыю кніг з аўтографамі. Сёння ў гэтай калекцыі аўтографы не толькі вядомых беларускіх пісьменнікаў, але і славутых сусветных дзеячаў мастацтва.



Кажа намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша.

– У фондах бібліятэкі захоўваецца безліч выданняў з аўтографамі вядомых асобаў, як нацыянальных, беларускіх, гэтак і сусветных. Натуральна аўтографы Барадуліна, Быкава, Брыля, Коласа, Купалы і іншых – у нас вельмі шырока прадстаўлены. Але ёсць аўтографы і Пікаса, і Сальвадора Далі, і Марка Шагала нават далёка не адзін, і Рамэна Ралана, і Віктара Гюго і многіх-многіх іншых.



З гэтай калекцыяй працуюць не толькі беларускія даследчыкі, але і навукоўцы са ўсяго свету.
Кажа Алесь Суша:

– Многія з гэтых калекцый вывучаюцца замежнымі даследчыкамі, як заходнееўрапейскімі, так і расейскімі. Ёсць вельмі цікавыя творы, напрыклад, расейскіх паэтаў, якія зафіксаваныя ў рукапісным выглядзе ў якасці аўтографаў на нашых кнігах, якія не ўвайшлі ў зборы твораў гэтых пісьменнікаў. Для нас гэта таксама ў пэўнай ступені і гонар, і радасць, што мы здолелі многае захаваць.

Апошнім часам усе гэтыя матэрыялы адлічбоўваюцца і робяцца даступнымі для даследчыкаў у інтэрнэце.


ВЫДАННІ З АЎТОГРАФА
EDITIONS WITH AUTOGRA
COLLECTIONS
Publiées sous la direction de M. ROGER ALLARD
LES PEINTRES FRANÇAIS NOUVEAUX Nº 31
MARC CHAGALL
GRAVURE DE
GEORGES AUBERT
GEORG W. MARC CHAGAL. PARIS. 1928
Выданне з аўтографам М. Шагала.
Марк Шагал (1887–1985) – жывапісец і графік. Адзін з самых знакамітых прадстаўнікоў мастацкага авангарда XX ст. Нарадзіўся ў Віцебску. Жыў у Расіі, Францыі, Германіі, Мексіцы і ЗША. М.Шагал працаваў у розных тэхніках, стварыў сотні палотнаў і графічных лістоў. Па эскізах мастака былі размаляваны плафоны тэатраў «Гранд-Апера» ў Парыжы і «Метраполітэн-опера» ў Нью-Йорку, зроблены вітражы Рэймскага сабора, касцёла Святога Стэфана ў г. Майнц, у будынку ААН у Нью-Йорку.
РАЦЫЯ


MÉTAMORPHOSE DE NARCISSE
(épuisé).
graphiques et un
MÉTAMORPHOS
E NARCISS
РАЦЫЯ


EXEMPLAIRE NUMÉRO
OVIDE
Les Métamorphoses
EAUX-FORTES ORIGINALES
DE
PICASSO
LAUSANNE
ALBERT SKIRA, ÉDITEUR
M. CM. XXXI
РАЦЫЯ


Выданне з аўтографам А. Адамовіча.
Алесь Адамовіч (1926 —1994) — беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Член-карэспандэнт АН БССР, доктар філалагічных навук, прафесар. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1957. Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989.
НІЛ ГІЛЕВІЧ * ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ
Выданне з аўтографам Н. Гілевіча.
Ніл Сымонавіч Гілевіч (1931—2016) — беларускі паэт і грамадскі дзеяч. Заслужаны дзеяч навукі БССР (1980 г.). Народны паэт Беларусі (1991 г.).

Фота аўтара